Известия Гомельского государственного университета
имени Ф. Скорины, №4(73), 2012

*УДК 947.6“1917-1918”:321.74*

# Паўночна-Заходняя абласная арганізацыя РСДРП(б) – партыя ўлады ў Беларусі (лістапад 1917 – люты 1918 г.)

Р.Р. ЛАЗЬКО

Зроблена спроба сацыя-псіхалагічнай характарыстыкі Паўночна-Заходняй абласной арганізацыі РСДРП(б), якая ад імя бальшавіцкай партыі ажыццяўляла ўладу ў Беларусі пасля Кастрычніцкага перавароту 1917 г. У гэтым кантэксце аналізуюцца вытокі яе нігілістычнага стаўлення да справы самавызначэння беларускага народа.

**Ключавыя словы:** РСДРП(б), Паўночна-Заходняя абласная арганізацыя, салдаты фронту, фарміраванне органаў улады, дэмабілізацыя, страта ўплываў, ідэя сусветнай рэвалюцыі, беларускі рух, антыбеларускі псіхалагічны комплекс, варожасць.

The author makes an attempt to characterize in social and psychological area the north-western regional organization RSDRP(b) which exercised its power on behalf of the Bolshevik party in Belarus after the October revolution of 1917. In this context the article analyzes the results of its nihilistic attitude towards the self-identification of Belarusian people.

**Keywords:** RSDRP(b), North-Western regional organization, front soldiers, authority formation, demobilization, loss of influence, idea of world revolution, Belarusian movement, anti-Belarusian psychological complex, hostility.

У апошнія гады беларуская гістарыяграфія ўзбагацілася цікавымі даследаваннямі сацыяльна-палітычнай сітуацыі ў Беларусі пасля прыходу бальшавікоў да ўлады [16], [24], [27 і інш.]. У іх аналізуюцца і адносіны паміж бальшавіцкімі ўладамі Заходняй вобласці і беларускімі нацыянальнымі арганізацыямі, а ў гэтай сувязі разглядаецца і пытанне аб роспуску Ўсебеларускага з’езда адпаведна з рашэннем Саўнаркама вобласці. Названы факт даследчыкі тлумачаць арыентацыяй бальшавіцкай арганізацыі не на дэмакратычныя пераўтварэнні, якія стаялі на парадку дня, а на сусветную рэвалюцыю. Адзначаецца таксама ўплыў ішоўшай таталітарнай эвалюцыі бальшавіцкай партыі на стаўленне яе абласной арганізацыі да беларускага руху. Згаджаючыся з гэтымі ацэнкамі, мы не можам прызнаць іх вычарпальнымі. Яны пакідаюць без адказу шэраг пытанняў, звязаных з фарміраваннем канфліктнай палітычнай сітуацыі ў Беларусі ў першыя месяцы савецкай улады, асобныя істотныя элементы якой прараслі новымі канфліктамі ў перыяд “другога прышэсця” бальшавікоў у Цэнтральную Беларусь пасля нямецкай акупацыі. Адно з такіх пытанняў выяўляецца пры супастаўленні палітыкі савецкай улады ў Беларусі і Украіне ў той самы час, дзе мясцовыя бальшавікі па загаду з цэнтра прыступілі да стварэння хай сабе і фармальнай, але асобнай Украінскай савецкай рэспублікі. Чаму гэта аказалася немагчымым у Беларусі? Дзеля пошуку адказаў на гэтае і іншыя пытанні, якія паглыбляюць разуменне адносін паміж савецкай уладай і беларускім нацыянальным рухам, неабходна больш пільна прыгледзецца да праваднікa палітыкі расійскага савецкага цэнтра ў Беларусі, звярнуць увагу на некаторыя асаблівасці яго сацыяльнай базы і псіхалогіі.

Гэтым праваднікам нацыянальнай палітыкі савецкага ўрада на беларускай тэрыторыі з’яўлялася Паўночна-Заходняя абласная арганізацыя РСДРП(б), якая аформілася ў верасні 1917 г. [23, с. 278–284]. Тады яна налічвала звыш 7 тысяч членаў партыі і каля 2 тысяч спачуваючых. Яе кадравы склад і арганізацыйная структура выяўлялі пэўную спецыфіку, здольную ў адпаведны момант пераўтварыцца ў відавочную слабасць арганізацыі, пагражаючую ёй істотнымі і драматычнымі наступствамі. Такой спецыфікай з’яўлялася колькасная перавага ў шэрагах абласной арганізацыі салдат трох армій Заходняга фронту: у арганізацыі II арміі налічвалася 2388 членаў партыі, X арміі – 1156, III арміі – 632. У буйнейшай тэрытарыяльнай арганізацыі – мінскай – налічвалася каля 1200 бальшавікоў, у іншых значна меней [23, с. 278–284], прычым ёсць падставы сцвярджаць, што і ў гэтых арганізацыях пераважалі служачыя тылавых рэзервовых часцей, а таксама арганізацый, абслугоўваўшых фронт. Выступаю-

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

чы на VI з’ездзе РСДРП, адзін з лідэраў мінскіх бальшавікоў прапаршчык А. Мяснікоў (праз месяц абраны старшынёй абласнога камітэта) прызнаваў слабасць апоры партыі сярод мясцовага намесніцтва: “Моцных сувязей з рабочымі няма, – казаў ён. – З прычыны блізасці да фронту наша арганізацыя па сутнасці ваенная” [6, с. 68].

Некаторы час, аднак, – пакуль фронт заставаўся адносна стабільным – гэта кадравая слабасць абласной арганізацыі была хутчэй патэнцыяльнай, чым актуальнай. Больш таго, распрапагандаваныя бальшавікамі салдаты Заходняга фронту паслужылі ім інструментам у захопе ўлады на фронце і ў Заходняй вобласці. Гэта была тая кардынальная задача, якая яшчэ на працягу месяца пасля перавароту ў Петраградзе паглынала большую частку іх часу і сіл. Пры гэтым адзначым, што тут бальшавікам давялося весці барацьбу не толькі з органамі Часовага ўрада і Заходняга фронту, але і са сваімі сапернікамі ў саветах і выбарных армейскіх органах. Справа ў тым, што шэраг мясцовых саветаў не падтрымалі Кастрычніцкі пераварот, называлі бальшавікоў “захопнікамі ўлады” і заклікалі народ змагацца з імі [18, с. 329]. Створаны ў Мінску на наступны дзень пасля перавароту ў сталіцы Ваенна-рэвалюцыйны камітэт не меў ні дастатковай сілы, ні неабходнага аўтарытэту, каб прымусіць існаваўшыя дэмакратычныя органы прызнаць уладу ленінскага Саўнаркама і яго прыхільнікаў у Заходняй вобласці. Усведамляючы гэта, мінскія бальшавікі імкнуліся падпарадкаваць сабе губернскія, абласныя і франтавыя саветы шляхам правядзення новых з’ездаў саветаў – губернскага сялянскіх дэпутатаў, рабочых і салдацкіх дэпутатаў Заходняй вобласці і франтавога з’езда салдацкіх дэпутатаў. Хоць выбары на гэтыя з’езды праводзіліся імі ў абход існаваўшых выбарных органаў саветаў і з парушэннямі дэмакратычнай працэдуры (асабліва першыя два) [гл. 24, с. 148–149], [27, с. 13–16], бальшавікам не ўдалося дамагчыся пераканаўчай перамогі. Далікатнасць сітуацыі падкрэсліваў факт існавання ў Мінску пасля гэтых выбараў на працягу значнага часу двух выканкамаў губернскага савета сялянскіх дэпутатаў – бальшавізаванага і эсэраўскага, прычым апошні быў абноўлены пасля альтэрнатыўных бальшавіцкім новых выбараў, праведзеных першага снежня старым кіраўніцтвам савета [27, с. 15].

Узяўшы на ўзбраенне прынцып “пераможцаў не судзяць” і абапіраючыся на франтавыя арганізацыі, мінскія бальшавікі паспяшаліся сфарміраваць агульныя для ўсіх саветаў органы ўлады, якія былі названыя Абласным выканаўчым камітэтам Заходняй вобласці і фронту (Аблвыканкамзах) з заканадаўчымі функцыямі і Саветам Народных Камісараў (СНК) Заходняй вобласці і фронту. Прадстаўніцтва ўсіх трох саветаў у гэтых органах улады было непрапарцыянальным: ад з’езда дэпутатаў Заходняга фронту ў склад Аблвыканкамзаха былі ўведзены 100 чалавек, ад двух іншых з’ездаў – па 35, ад прафсаюзаў – 11 чалавек і па некалькі чалавек – ад саюзаў чыгуначнікаў і паштова-тэлеграфных служачых. Характэрна, што такое прадстаўніцтва было прынята адпаведна з пастановай франтавога з’езда дэпутатаў [4, с. 287]. У партыйных адносінах у новых органах улады пераважалі бальшавікі (звыш 70%) і левыя эсэры (каля 18%). Беларускія нацыянальныя арганізацыі засталіся па-за гэтымі органамі, з імі нават не вяліся сур’ёзныя перагаворы [16, с. 51].

Новыя органы ўлады пачалі функцыянiраваць 26 лістапада. Але і пасля іх стварэння паралельна працягвалі дзейнічаць органы гарадскіх і земскіх кіраванняў, якія даволі паспяхова займаліся надзённымі мясцовымі справамі. Як піша беларускі даследчык, “па сутнасці, да канца 1917 года паралельна існавалі дзве ўлады – абраных летам-восенню самакіраванняў і надзеленых уладнымі паўнамоцтвамі саветаў” [27, с. 27].

Улада створаных Паўночна-Заходняй абласной арганізацыяй бальшавікоў новых органаў была няпоўная і ў геаграфічных адносінах, бо ў іх не былі прадстаўлены саветы Віцебскай і Магілёўскай губерняў. Тут па розных прычынах новыя бальшавізаваныя савецкія органы ўлады былі створаны пазней і на Мінск не арыентаваліся: у Віцебску з-за існаваўшай арыентацыі мясцовых бальшавікоў на геаграфічна блізкі ім Петраград і саперніцтва двух бальшавіцкіх цэнтраў – Віцебскага і Мінскага [гл. 25, с. 39]; у Магілёве – з-за відавочнай перавагі ў губерні ўплываў партыі эсэраў.

Новыя выбары ў губернскія і абласныя саветы супалі з завяршаючым этапам іншай палітычнай кампаніі – выбараў ва Ўстаноўчы сход, якая да таго часу цягнулася ўжо некалькі месяцаў, паспеўшы набыць стратэгічнае значэнне ва ўспрыняцці галоўных палітычных сіл

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

краю, за выключэннем беларускіх арганізацый[1]. Такое ўспрыняцце гэтых выбараў было абумоўлена ацэнкай Устаноўчага сходу, што паспела замацавацца ў грамадскай свядомасці, як “гаспадара зямлі рускай”, які замацуе праведзеныя пасля Лютаўскай рэвалюцыі пераўтварэнні і створыць законныя падставы для іх далейшага развіцця. У цэлым па вобласці бальшавікі на гэтых выбарах атрымалі пераканаўчую перамогу: 50,7% галасоў, у два разы болей, чым у цэлым па краіне. Іх галоўныя сапернікі эсэры атрымалі 32,2%. Найбольш значным поспех бальшавікоў быў у акрузе Заходняга фронту, дзе за іх спіс было пададзена 66,7% галасоў [28, с. 11–12], [25, с. 135]. У існуючай літаратуры мы не знаходзім дастаткова пераканаўчага тлумачэння гэтага несумненнага поспеху, асабліва відавочнага на фоне таго палітычнага трукацтва, да якога ў той самы час бальшавікі былі вымушаны звяртацца на выбарах у губернскія і абласныя саветы. На нашу думку, гэты іх поспех у цэлым па вобласці лягчэй зразумець у супастаўленні з не менш відавочнай няўдачай у Мінску, дзе яны прайгралі блоку Аб’яднанай яўрэйскай сацыялістычнай партыі і меншавікоў (23% супраць 50%) [17, с. 53], і ў Магілёўскай выбарчай акрузе, дзе атрымалі толькі 12,8% галасоў супраць 81% галасоў, пададзеных за эсэраў [26, с. 135]. Як бачым, бальшавікі прайгралі ў буйных адміністрацыйных і прамысловых цэнтрах, дзе іх палітычныя сапернікі мелі моцную апору ў выглядзе ўласных арганізацыйных структур, земскіх і тылавых органаў (Магілёўская губерня) і спрыянне з боку камандавання Заходняга фронту і Стаўкі. Тут прапагандысцкая дзейнасць бальшавікоў, якая, у асноўным, праводзілася праз салдат фронту, сустракала эфектыўнае супрацьдзеянне. Але ў той жа час, ва ўмовах дэзарганізацыі фронту, салдаты-агітатары паспяхова даходзілі да мас па-за гэтымі цэнтрамі, папулярна тлумачачы сялянам і насельніцтву перыферыйных гарадоў, навошта ім трэба галасаваць за бальшавіцкі спіс на выбарах ва Ўстаноўчы сход. Адзін з такіх агітатараў, якому давялося служыць у Бабруйску, успамінаў, што ўсе довады сваіх праціўнікаў у саветах і прафсаюзах бальшавікі “разбівалі, зводзячы да двух галоўных пытанняў: да пытання аб уладзе і цягнуўшайся імперыялістычнай вайны”. А ў вёсцы, акрамя таго, акцэнтавалася патрабаванне спынення вайны і перадачы сялянам зямлі без выкупу [7, с. 180, 182–183] – найбольш балючыя пытанні сялянскага жыцця. Варта падкрэсліць, што, выносячы гэтыя пытанні ў цэнтр сваёй агітацыйнай перадвыбарчай кампаніі, бальшавікі Заходняй вобласці ставіліся да выбараў ва Ўстаноўчы сход цалкам сур’ёзна, прынцыпова. Так, напрыклад, 2-я абласная партыйная канферэнцыя, якая праходзіла ў Мінску 5–7 кастрычніка 1917 г., паслаўшы прывітанне Леніну і Зіноўеву, выказала надзею, што “на ганаровых месцах ва Ўстаноўчым сходзе мы ўбачым сваіх правадыроў Леніна, Зіноўева і іншых” [9, с. 354]. На гэтай пазіцыі бальшавіцкая арганізацыя вобласці заставалася і пазней, яшчэ праз месяц пасля кастрычніцкага перавароту [4, с. 258], [15, с. 165]. Такім чынам, бальшавікі вобласці атрымалі на выбарах падтрымку салдацкіх і сялянскіх мас як партыя, ішоўшая ва Ўстаноўчы сход з найбольш радыкальнай *дэмакратычнай* праграмай, як тая партыя, якая збіралася ўзаконіць, легалізаваць запатрабаваныя і ўжо пачатыя пераўтварэнні рашэннямі Ўстаноўчага сходу. Змена арыентацыі на Ўстаноўчы сход на супрацьлеглую была праведзена бальшавіцкай арганізацыяй Заходняй вобласці ў снежні адпаведна з дырэктывамі петраградскага цэнтра, якія грунтаваліся на ацэнцы вынікаў выбараў у агульнарасійскім маштабе. Яны, як вядома, закончыліся пройгрышам бальшавікоў (22,5% галасоў супраць 60,5% галасоў эсэраў і іншых сацыялістычных партый) і пагражалі ім адхіленнем ад улады дэмакратычным шляхам.

Змена курса заходнеабласной арганізацыі бальшавікоў у адносінах да Ўстаноўчага сходу спалучалася з іншымі фактарамі, якія ўздзейнічалі на розныя слаі насельніцтва і ўсе разам вялі да агульнага выніку – няўхільнага зніжэння даверу насельніцтва вобласці да бальшавіцкай партыі, звужэння яе сацыяльнай базы. Сярод гэтых фактараў неабходна назваць анархію ў вёсцы пры ажыццяўленні дэкрэта аб зямлі, няздольнасць уладаў справіцца з забеспячэннем гарадоў харчаваннем і палівам, рост злачыннасці [12, с. 269–271], [17, с. 53–54, 61]. У гэтай сітуацыі паміж новай уладай і шырокімі слаямі насельніцтва, асабліва гараджан, інтэлігенцыі, пачалі хутка складвацца адносіны адчужэння і ўзаемнай нецярпімасці.

[1] Беларускія нацыянальныя арганізацыі ўжо зарыентаваліся на скліканне Ўсебеларускага ўстаноўчага сходу, хоць з характэрнай для іх раз’яднанасцю ўдзельнічалі і ў выбарах расійскага Ўстаноўчага сходу [гл. 24, с. 164].

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Тым часам разгарнулася стыхійная дэмабілізацыя Заходняга фронту, фактычны яго распад, падрыхтаваны папярэдняй працяглай палітыкай бальшавікоў, накіраванай на пераўтварэнне імперыялістычнай вайны ў грамадзянскую. Мяснікоў, адзін з мясцовых праваднікоў гэтай палітыкі, яшчэ ў канцы 1922 г. з поўным цынізмам расказваў аб дзейнасці яго мінскай арганізацыі летам 1917 г. з мэтай разлажэння войск фронту, якая абарочвалася вялізнымі стратамі сярод рускіх войск. На ўчастку, дзе вёў прапаганду супраць наступлення сам Мяснікоў, "паклалі цэлую дывізію, але з наступлення нічога не выйшла" [14, с. 136]. Дасягнулі, аднак, галоўнага – салдацкія масы пайшлі за бальшавікамі, праціўнікамі вайны. На працягу наступнай паловы года бяздзеянне войск, пагаршэнне іх забеспячэння і антываенная прапаганда бальшавікоў, якая пазбаўляла вайну ўсялякага сэнсу, на фоне агульнага пагаршэння сітуацыі ў краіне прывялі да поўнай дэзарганізацыі і дэмаралізацыі часцей фронту. Дайшло да таго, адзначае расійскі даследчык, што рускія салдаты "прадавалі немцам гаспадарчы інвентар, хлеб, жывёлу і коней. Пашыралася эпідэмія дзяльбы грашовых скрынак вайсковых часцей паміж салдатамі, якія звальняліся" [20, с. 23]. Выпадкі рабавання салдатамі цывільнага насельніцтва пераўтварыліся ў жахлівую паўсядзённасць. Масы дэмаралізаваных узброеных людзей пакідалі свае пазіцыі, гвалтам бралі цягнікі і адпраўляліся ў тыл. Гэта "войска" не толькі страціла баяздольнасць (што канстатавала і германскае камандаванне), але і стала небяспечным для цывільнага насельніцтва і нават для новай улады. Усведамляючы гэта, Аблвыканкамзах і камандаванне Заходняга фронту на чале з Мяснiковым, маючы згоду галоўнакамандуючага Крыленкі, імкнуліся як найхутчэй пазбавіцца ад старой арміі: "Яна не прыдатная для нас… Тады давайце разложым яе, і чым хутчэй мы гэта зробім, тым лепш, хутчэй пазбавімся ад гэтай абузы", – так Мяснікоў тлумачыў логіку сваіх паводзін [14, с. 136]. Пры гэтым кіраўніцтва вобласці і фронту старалася пакінуць найбольш баяздольныя (і, натуральна, найбольш бальшавізаваныя часці), пераўтвараючы іх у апору новай улады. Але гэта была малая частка асабовага складу фронту[2]. Да таго ж лепшыя бальшавізаваныя часці давялося адправіць на поўдзень для барацьбы з Украінскай Цэнтральнай Радай.

У выніку бальшавіцкая партыя Беларусі апынулася заложніцай сваёй палітыкі абяззбройвання Расійскай дзяржавы ў інтарэсах рэвалюцыі, якую праводзіла на працягу вайны. Яна мусіла заплаціць за гэту палітыку стратай сваёй асноўнай апоры ў Беларусі – салдацкіх мас Заходняга фронту – і агаліць сярмяжскую грубую праўду аб немясцовым, небеларускім характары сваёй Паўночна-Заходняй абласной арганізацыі і ўстаноўленай ёю ўлады. 23 снежня 1917 г. у Мінску адбылася трэцяя надзвычайная абласная і франтавая канферэнцыя РСДРП(б). Яе дэлегаты прадстаўлялі каля 60 тысяч членаў партыі і спачуваючых [23, с. 311], [4, с. 958]. На першы погляд, канферэнцыя выявіла выдатны рост абласной партыйнай арганізацыі за некалькі месяцаў, прайшоўшых пасля першай, вераснёўскай канферэнцыі, якая зафіксавала 7 тысяч членаў партыі і 2 тысячы спачуваючых. Але калі параўнаць з 2-ой абласной партыйнай канферэнцыяй, якая адбылася 5–7 кастрычніка, то даводзіцца прызнаць, што пасля кастрычніцкага перавароту партыйная арганізацыя вобласці перажывала хутчэй застой (у асабова-колькасных адносінах), чым рост, бо на другой канферэнцыі былі прадстаўлены звыш 56 тысяч членаў партыі і спачуваючых [23, с. 285]. А ў пачатку 1918 г. наогул адбываўся спад шэрагаў абласной арганізацыі, які ў другой палове лютага, у момант аднаўлення вайны з Германіяй, прыняў катастрафічны характар. У выніку на акупіраванай тэрыторыі замест масавай партыйнай арганізацыі засталося толькі ядро "чалавек 25–30", якім кіраваў паспешліва створаны раённы камітэт [21, с. 86].

Такі пераважна вайсковы характар абласной бальшавіцкай арганізацыі накладваў на яе спецыфічны адбітак, які моцна адрозніваў яе ад партыйных арганізацый іншых нацыянальных раёнаў Расіі. Усе яны стаялі на дагматычна-інтэрнацыяналісцкіх пазіцыях, мяркуючы, што рэвалюцыя ў Расіі паслужыць штуршком да хуткай і непазбежнай пралетарскай рэвалюцыі ў іншых, больш развітых і таму лепш падрыхтаваных да яе краінах. Менавіта да гэтай, сусветнай рэвалюцыі, рыхтавалі яны рабочы клас сваіх рэгіёнаў, праводзячы прапаганду ў інтэрнацыяна-

[2] Нам невядомы агульны колькасны склад гэтых часцей. Аднак агульная колькасць баявога складу ўсяго фронту ў лютым 1918 г., перад наступленнем немцаў, у параўнанні з сакавіком 1917 г. скарацілася на 80–85% [20, с. 24].

льным духу, у духу салідарнасці з рэвалюцыйнымі сіламі Расіі і замежных краін. Такая ідэалагічная пазіцыя прымушала бальшавіцкія арганізацыі ў нацыянальных раёнах глядзець на рашэнне дэмакратычных задач, уключаючы і барацьбу супраць нацыянальнага ўціску, толькі як на сродак падрыхтоўкі мас гэтых рэгіёнаў да сапраўднай – сусветнай пралетарскай рэвалюцыі. Калі ж пасля прыходу бальшавікоў да ўлады, на фоне прыкмет крызісу ў іншых краінах, з'явіліся падставы меркаваць, што інтэрнацыянальная пралетарская рэвалюцыя ўжо пачынаецца, задачы барацьбы за нацыянальнае вызваленне наогул успрымаліся як прыкрая замінка на шляху барацьбы за сусветную рэвалюцыю. "Працоўнае сялянства, рабочыя і салдаты ўсіх народнасцей пойдуць поруч супраць агульнага ворага – буржуазіі, пад агульнымі сцягамі, з агульнымі лозунгамі" ў барацьбе за народаўладдзе і мір, – гаварылася ў закліку СНК Заходняй вобласці і фронту і ВРК фронту ад 5 снежня 1917 г. "І ўсе правы працоўных у галіне іх быту, мовы і г. д. будуць забяспечаны поўнасцю толькі шляхам гэтай барацьбы – міжнароднай, класавай, а не нацыянальнай" [4, с. 377]. Але падкрэслім, такой была агульная пазіцыя бальшавіцкіх арганізацый, працаваўшых у нацыянальных рэгіёнах. Яна прымушала Леніна нярэдка асабіста ўмешвацца ў іх паводзіны, цярпліва, хоць і не заўсёды паспяхова, папраўляць іх, каб не забягалі наперад і не шкодзілі актуальнай лініі партыі [гл. 22, с. 84–85].

Спецыфіка ўплыву догмы сусветнай рэвалюцыі на дзейнасць Паўночна-Заходняй абласной арганізацыі бальшавікоў выяўлялася ў яго спалучэнні з антыбеларускім псіхалагічным комплексам яе кіраўніцтва, што за даволі кароткі час сфарміравала яго востра агрэсіўную антыбеларускую палітычную пазіцыю. Добра ўсведамляючы характар сваёй арганізацыі як пераважна франтавой, салдацкай [11, с. 217] і тым самым не меўшай істотнай ідэалагічна абумоўленай апоры сярод карэннага насельніцтва, прызнаючы і сябе людзьмі выпадковымі ў Беларусі [10, с. 43, 107], кіраўнікі арганізацыі не настроены былі на тое, каб з дастатковай увагай падыйсці да праблемы самавызначэння беларускага народа, стаўшай актуальнай у 1917 г. Ставіўся пад сумненне нават факт яго існавання як асобнага этнасу. Прызнанне існавання беларускага народа са сваімі прыроджанымі правамі і інтарэсамі пры амаль поўнай адсутнасці прадстаўнікоў гэтага народа ў мясцовай бальшавіцкай арганізацыі лагічна вяло да высновы, што іншыя арганізацыі, а не бальшавікі, з'яўляюцца выразнікамі яго інтарэсаў. Яшчэ амаль праз год пасля прыходу бальшавікоў да ўлады В. Кнорын пісаў у бальшавіцкай "Звезде": "Да апошняга часу… мы лічылі, што беларусы не з'яўляюцца нацыяй. Тыя этнаграфічныя асаблівасці, якія аддзяляюць іх ад *астатніх рускіх (*падкр. мною. – *Р.Л.*) павінны быць зжытыя. Нашай задачай з'яўляецца не стварэнне новых нацый, а знішчэнне старых нацыянальных рагатак" [10, с. 33]. Ідэалагічны дагматызм і адчуванне сваёй чужароднасці ў краі, у які закінуў лёс, у сваім спалучэнні сфарміравалі не проста нігілістычнае, а варожае стаўленне лідэраў Паўночна-Заходняй арганізацыі РСДРП(б) – пазней РКП(б) – да нацыянальнага руху беларускага народа. Гэты рух аб'ектыўна перашкаджаў ім з поўным пераканаlittleннем і годнасцю выконваць сваю місію служэння сусветнай рэвалюцыі. Неабходнасць ліквідаваць гэтую перашкоду ў ажыццяўленні высокай місіі апраўдвала ўжыванне супраць яе самых жорсткіх сродкаў. Сярод іх адмаўленне існавання беларускай нацыі было кардынальным, але не самым вострым. З вясны 1917 г., калі бальшавікі ў Мінску ўпершыню сутыкнуліся з арганізаваным беларускім рухам, яны імкнуліся пераканаць сялян, сярод якіх шукалі апору, што гэты рух з'яўляецца справай мясцовых памешчыкаў і ставіць сваёй мэтай адарваць беларускіх рабочых і сялян ад працоўных мас усёй Расіі, каб падпарадкаваць тым жа памешчыкам [19, с. 132–133]. Аднак прапаганда ў гэтым духу пасля прыходу бальшавікоў да ўлады была, як мінімум, мала эфектыўнай, аб чым сведчыць факт іх уцёкаў з Мінска 18 лютага 1918 г. пры першым паведамленні аб наступленні немцаў. Яны адыходзілі пад варожыя выкрыкі мінчан і нават закідванне іх каменнем з тратуараў [3, л. 11], [1, л. 25]. Ведаючы аб варожым стаўленні да сябе з боку мясцовага насельніцтва, бальшавіцкія ўлады вобласці нават не спрабавалі арганізаваць супраціўленне немцам. Гэта сведчыць аб тым, што за два месяцы сваёй вострай барацьбы супраць беларускага нацыянальнага руху (пасля разгону з'езда яго прадстаўнікоў) бальшавікі Заходняй вобласці разыйшліся і з шырокімі масамі насельніцтва Беларусі. Беларускія рабочыя і сяляне не прынялі іх "высокую" місію служэння сусветнай рэвалюцыі.

Бясслаўнае заканчэнне першых 100 дзён бальшавіцкай улады ў Беларусі завяршыла фарміраванне ў іх менталітэце антыбеларускага комплексу, у аснове якога ляжала ідэалагіч-

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

нае непрыняцце беларускага нацыянальнага руху. Цяпер ідэалагічна абумоўленая палітычная варожасць да яго дапоўнілася звычайнай, рацыянальна не матываванай нянавісцю. Таму зусім не пустым гукам, не звычайным запалохваннем праціўніка былі заявы лідэраў абласной бальшавіцкай арганізацыі ў момант вяртання іх улады на Міншчыну ў канцы 1918 г. накшталт пагрозы Мяснікова павесіць на ліхтарах усю "беларуска-авантурніцкую шайку" [13, с. 184]. Гэта былі заявы аб намерах, якія неўзабаве ўвасобіліся ў інструкцыі створаных імі органаў улады праваднікам адпаведнай палітыкі на месцах: "Будзь бязлітасны да ворага свайго. За горла яго і калена на грудзі" – заклікаў адзін з першых загадаў Мінскага губрэўкама [5, с. 72].

Зразумела, сам стан беларускага нацыянальнага руху, які спазняўся ў сваім развіцці ў параўнанні з рухамі суседніх народаў, таксама ўплываў на фарміраванне адносін да яго з боку Паўночна-Заходняга абласнога камітэта РСДРП(б) – спачатку нігілістычных, а потым і адкрыта варожых. Аднак яго запозненасць менш уплывала на гэты працэс як у параўнанні з адзначанымі вышэй ідэалагічнымі і псіхалагічнымі фактарамі, так і да пэўнага часу ў параўнанні з іншымі нацыянальнымі рухамі ў Беларусі – украінскім у часцях Заходняга фронту і ў суседняй Украіне, мясцовым польскім рухам, знайшоўшым падтрымку з боку 1-га польскага корпуса былой расійскай арміі. Слабасць беларускага руху толькі стварала магчымасць да пэўнага часу недаацэньваць яго як палітычнага праціўніка, але не была прычынай, каб не бачыць яго як аб'ектыўную рэальнасць, народжаную ў рэчышчы гістарычнага развіцця беларускага народа. На працягу восені 1917 г., на вачах у бальшавікоў, беларускі рух хутка рос, набываў уплывы, што неўзабаве выявілася ў правядзенні масавага Усебеларускага з'езда. Сам Кнорын сведчыць, што мінскія бальшавікі яшчэ ўлетку 1917 г. разумелі, на якой мове неабходна было звяртацца да беларускіх сялян, калі спрабавалі распаўсюджваць сярод іх свае адозвы, – менавіта на беларускай. "Але нязначнае распаўсюджванне гэтых адозваў (сяляне не ўмелі чытаць нават на рускай мове. – *Р.Л.*), адсутнасць працаўнікоў, ведаючых беларускую мову ў партыі, зрабілі тое, што надалей гэта практыка была закінута… Дзякуючы гэтаму, на працягу году спецыфічная беларуская праца праходзіла па-за партыяй і зрабілася справай чужых для партыі элементаў" [11, с. 217]. Гэта праца, з пункту гледжання бальшавіцкіх лідэраў Заходняй вобласці, не вартая была часу і сіл менавіта таму, што матывы дзейнасці бальшавіцкай арганізацыі краю знаходзіліся па-за інтарэсамі беларускага народа.

Шмат вады сплыло, перш чым Кнорын з таварышамі набылі здольнасць з павагай, хоць і з ранейшай варожасцю, паставіцца да дзейнасці "чужых для партыі элементаў" і вынесці крытычныя высновы з уласнага вопыту. Першым вымушаным крокам у гэтым накірунку была вядомая рэакцыя на скліканне беларускімі арганізацыямі Ўсебеларускага з'езда, якая развівалася ад яго недаацэнкі як палітычнай з'явы да спробаў расколу і зрыву, а ўрэшце завяршылася яго гвалтоўным разгонам па загаду Саўнаркама вобласці. Паспяховая праца гэтага прадстаўнічага форума падштурхнула абласную бальшавіцкую арганізацыю да разгляду ўпершыню ў сваёй гісторыі нацыянальнага пытання. Яно было пастаўлена на парадак дня 3-й абласной партыйнай канферэнцыі, якая была прызначана 15 снежня і адбылася 23 снежня 1917 г. Даклад зрабіў К. Ландар. На жаль, ні пратакол яго абмеркавання, ні прынятая рэзалюцыя не захаваліся [1, л. 45, 54], [4, с. 529, 626–628] (магчыма, зусім не выпадкова). Аднак сэнс прынятага канферэнцыяй рашэння няцяжка зразумець, прасочваючы паводзіны бальшавіцкіх уладаў вобласці ў адносінах да беларускага руху ад гэтага часу і да іх зыходу ў лютым з Міншчыны на ўсход, бліжэй да сваёй прарадзімы. Рашэнне было відавочна канфрантацыйным.

**Літаратура**

1. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ). – Ф. 35-п. – Воп. 1. – Спр. 71.
2. НАРБ. – Ф. 60 (цяпер 1440). – Воп. 3. – Спр. 211.
3. НАРБ. – Ф. 1440. – Воп 3. – Спр. 433.
4. Великая Октябрьская Социалистическая революция в Белоруссии. Документы и материалы. Т. 2 : Победа социалистической революции и упрочение советской власти в Белоруссии (октябрь 1917 – март 1918 г.). – Минск : Госиздат БССР, 1957.
5. Революционные комитеты БССР (ноябрь 1918 – июль 1920 г.) : сб. док. и материалов. – Минск, 1961.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

6. Шестой съезд РСДРП (большевиков). Протоколы. – М. : Гос. изд-во полит. литературы, 1958.

7. В борьбе за Октябрь в Белоруссии и на Западном фронте. Воспоминания активных участников Октябрьской Революции. – Минск : Гос. изд-во БССР, 1957.

8. Ігнатоўскі, У. Вялікі Кастрычнік на Беларусі (X 1917 – II/VII 1920) / У. Ігнатоўскі // Беларусь. Нарысы гісторыі, культуры і рэвалюцыйнага руху. – Мінск, 1924.

9. Кастрычнік на Беларусі : зб. артыкулаў і дакументаў. – Мінск, 1927.

10. Кнорин, В.Г. Избранные статьи и речи / В.Г. Кнорин. – Минск : Беларусь, 1990.

11. Кнорын, В. Камуністычная партыя на Беларусі / В. Кнорын // Беларусь. Нарысы гісторыі, культуры і рэвалюцыйнага руху. – Мінск, 1924.

12. Лёсік, Я. Мінск / Я. Лёсік // Творы. – Мінск : Маст. літаратура, 1994. (Аўтар перадае апакаліпсічнага маштабу карціны, якія назіралі мінчане штодня ў пачатку 1918 г. Гл. тут с. 269–271).

13. Мясников, А.Ф. Избранные произведения / А.Ф. Мясников. – Ереван : Изд-во Айастан, 1965.

14. Мясников, А.Ф. О работе партии на Западном фронте в 1917–1918 гг. / А.Ф. Мясников // Избранные произведения. – М. : Политиздат, 1985.

15. Солский, В. 1917 год в Западной области и на Западном фронте / В. Солский ; науч. ред. С.Н. Хомич. – Минск : Тесей, 2004.

16. Гігін, В.Ф. Шляхі фарміравання кааліцыі бальшавікоў з рэвалюцыйна-дэмакратычнымі партыямі ў перыяд усталявання савецкай улады / В.Ф. Гігін // Весці НАН Беларусі : серыя гуманітарных навук. – № 3. – Мінск, 2002.

17. Гісторыя Беларусі : у 6 т. Т. 5. Беларусь у 1917–1945 гг. / А. Вабішчэвіч [і інш.] ; рэдкал. М. Касцюк (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : Экаперспектыва, 2006. – 613 с.

18. Игнатенко, И.М. Беднейшее крестьянство – союзник пролетариата в борьбе за победу Октябрьской революции в Белоруссии (1917–1918 гг) / И.М. Игнатенко. – Минск, 1962. – 498 с.

19. Казеко, И.И. М.В. Фрунзе. Революционная деятельность в Белоруссии / И.И. Казеко. – Минск : Беларусь, 1983.

20. Краснокутский, В.В. Демобилизация русской армии в 1917–1918 гг. (на примере Западного фронта : автореф. дис. … канд. ист. наук : 07.00.02 / В.В. Краснокутский. – М. : МГУ, 1997.

21. Майзель, Ю. Кароткі нарыс гісторыі КП(б)Б / Ю. Майзель, М. Шапавалаў. – Менск : Белдзяржвыдавецтва, 1929.

22. Макарова, Г.П. Осуществление ленинской национальной политики в первые годы советской власти. 1917–1920 гг. / Г.П. Макарова. – М. : Наука, 1969.

23. Очерки истории Коммунистической партии Белоруссии. Ч. 2. – Минск, 1961. – 399 с.

24. Рудовіч, С. Час выбару: праблема самавызначэння Беларусі ў 1917 годзе / С. Рудовіч. – Мінск : Тэхналогія, 2001.

25. Серебрякова, З.Л. Областные объединения Советов России. Март 1917 – дек. 1918 / З.Л. Серебрякова. – М. : Изд-во «Наука», 1977.

26. Сташкевич, Н.С. Приговор революции: крушение антисоветского движения в Белоруссии (1917–1925) / Н.С. Сташкевич. – Минск, 1985.

27. Сяменчык, М.Я. Грамадска-палітычнае жыццё на Беларусі ў перыяд Лютаўскай і Кастрычніцкай рэвалюцый (сакавік 1917 – сакавік 1918 гг.) / М.Я. Сяменчык. – Ч. II : Грамадска-палітычнае жыццё ва ўмовах складвання таталітарнага рэжыму. – Мінск : БДПУ імя М. Танка, 2011. – 159 с.

28. Урбановіч, А. Устаноўчы сход / А. Урбановіч // ЭнГіБел. – Т. 6, кн. 2 : Усвея – Яшын ; дадатак. – Мінск : Бел. энцыклапедыя, 2003.

Гомельский государственный
университет им. Ф. Скорины

Поступило 14.03.12

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ имени Ф. Скорины